Галоўнымі тэндэнцыямі транснацыяналізацыі XXI ст. з’яўляюцца: 1) змена геаграфіі галін сусветнай гаспадаркі з-за размяшчэння філіялаў ТНК у краінах, якія развіваюцца; 2) павелічэнне колькасці ТНК у сферы паслуг; 3) рост долі дзяржаў, якія развіваюцца, у сусветнай структуры пераважна за кошт Азіяцкага рэгіёна; 4) узмацненне пазіцый і ролі Кітая.

**Падвядзём вынікі.** Транснацыяналізацыя — гэта ... . Асноўнымі фактарамі яе развіцця з’яўляюцца ... .

ТНК адрозніваюцца па месцы размяшчэння, відзе дзейнасці, колькасці краін-гаспадароў, колькасці галін спецыялізацыі.

Па колькасці ТНК доўгі час лідзіраваў ... рэгіён, у другой палове XX ст. стала павялічвацца доля ... рэгіёна. Сярод краін свету па колькасці ТНК у XXI ст. у першую пяцёрку ўваходзіць ... . З кожным годам павялічваецца колькасць ТНК у ... .

***Праверым свае веды.*** 1. Чым можна растлумачыць узнікненне інтэрнацыяналізацыі ў свеце? 2. У чым адрозненне транснацыяналізацыі ад інтэрнацыяналізацыі? 3. Па якіх прыкметах можна падзяліць ТНК? 4. Якімі прыкметамі адрозніваліся ТНК на розных стадыях развіцця сусветнай гаспадаркі? 5. Якое размеркаванне ТНК па рэгіёнах свету, сектарах і галінах сусветнай гаспадаркі? 6. Чым тлумачацца і ў чым заключаюцца асаблівасці структуры ТНК у XXI ст.? 7. У чым заключаюцца асаблівасці геаграфіі гарадоў па колькасці штаб-кватэр ТНК?

***Ад простага да складанага.*** Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, падрыхтуйце прэзентацыю аб найбуйнейшых ТНК XXI ст.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце вусны часопіс «Геаграфія найбуйнейшых сусветных ТНК».

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***
Пералік найбуйнейшых ТНК свету паводле ацэнкі Forbes.

§16-1

## § 17. Міжнародная эканамічная інтэграцыя

***Успамінаем.*** Чаму краіны ўтвараюць гандлёвыя і эканамічныя саюзы? Якія вядучыя інтэграцыйныя аб’яднанні існуюць у свеце? Якое іх значэнне ў свеце? Якія асноўныя мэты стварэння Еўрапейскага саюза, СНД?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму ў цяперашні час паміж краінамі ствараюцца інтэграцыйныя аб’яднанні? Па якой прычыне найбольшая колькасць інтэграцыйных аб’яднанняў узнікае ў краінах, якія развіваюцца?

**Перадумовы і стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі.** На пэўных этапах развіцця сусветнай гаспадаркі краіны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой не толькі ў рамках міжнароднага геаграфічнага падзелу працы, але і шляхам стварэння аб’яднанняў эканамічнага характару. Адной з праяў інтэрнацыяналізацыі сусветнай гаспадаркі з’яўляецца міжнародная эканамічная інтэграцыя.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Адносна высокі ўзровень эканамічнага развіцця, каб вытрымліваць канкурэнцыю з іншымі краінамі па вытворчасці тавараў і паслуг

2. Прыкладна аднолькавы ўзровень эканамічнага развіцця, інакш перавагі будзе атрымліваць больш развітая краіна ў шкоду менш развітым

3. Падобныя палітычныя сістэмы і агульныя гістарычныя і культурныя традыцыі

4. Геаграфічная блізкасць краін

Мал. 118. Перадумовы міжнароднай эканамічнай інтэграцыі

**Міжнародная эканамічная інтэграцыя — найвышэйшая ступень інтэрнацыяналізацыі, пры якой адбываецца зрошчванне нацыянальных гаспадарак на аснове глыбокіх устойлівых узаемасувязей і падзелу працы і фарміруецца агульная прастора з адзінай валютна-фінансавай, прававой сістэмай і каардынацыяй эканамічнай палітыкі дзяржаў.**

Для развіцця інтэграцыйных працэсаў паміж краінамі існуе шэраг перадумоў (мал. 118). У апошнія гады з-за фарміравання інтэграцыйных аб'яднанняў паміж рэгіёнамі зніжаецца значэнне геаграфічнай блізкасці краін — удзельніц інтэграцыі.

$П_1$

***Паразважаем.*** Калі XVII ст. – першая палова XX ст. сталі эпохай фарміравання незалежных нацыянальных дзяржаў, то ў другой палове XX ст. пачаўся працэс іх раздзялення. Гэта тэндэнцыя спачатку атрымала развіццё толькі ў Еўропе, але затым распаўсюдзілася і на іншыя рэгіёны. Чаму ў свеце назіраецца падзел раней адзіных дзяржаў?

У залежнасці ад узаемадзеяння паміж краінамі вылучаюць шэсць стадый эканамічнай інтэграцыі (мал. 119).

Любая эканамічная інтэграцыя пачынаецца з міждзяржаўных гандлёвых пагадненняў. У выніку на першай стадыі ўтвараюцца зоны пэўных гандлёвых дамоўленасцей паміж краінамі, або зоны прэферэнцый.

*Прэферэнцыйная зона* аб'ядноўвае краіны, ва ўзаемным гандлі якіх паніжаны або адменены мытныя пошліны



Мал. 119. Стадыі эканамічнай інтэграцыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на пэўныя тавары, якія ўвозяцца. Другой стадыяй эканамічнай інтэграцыі з'яўляецца *зона свабоднага гандлю* — аб'яднанне краін з мэтай ліквідацыі мытных пошлін і колькасных абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, але з захаваннем іх самастойнасці ў правядзенні знешнегандлёвай палітыкі ў дачыненні да краін-няўдзельніц.

**У свеце цікавага.** Напрыклад, у 1960 г. была ўтворана Еўрапейская асацыяцыя свабоднага гандлю ЕАСГ, у 1984 г. — Арганізацыя Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва, у 1994 г. — Паўночнаамерыканская зона свабоднага гандлю НАФТА, якая аб'яднала ЗША, Канаду і Мексіку.

На трэцяй стадыі адбываецца ўтварэнне *мытных саюзаў*. Яно прадугледжвае нараўне з функцыянаваннем зоны свабоднага гандлю ўсталяванне адзіных гандлёвых тарыфаў у дачыненні да трэціх краін. Напрыклад, у 1969 г. быў утвораны Паўднёваафрыканскі мытны саюз, у 1995 г. сярод краін СНД быў створаны Мытны саюз, які аб'яднаў Расію, Беларусь, Казахстан і Кіргізію.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Напрыклад, у 1960 г. быў утвораны Цэнтральнаамерыканскі агульны рынак, у 1969 г. — Андскі агульны рынак, у 1975 г. — Карыбскі агульны рынак — КАРЫКАМ, які аб'яднаў гаспадаркі астраўных дзяржаў рэгіёна.

Чацвёртай стадыяй выступае *агульны рынак*. Для яго нараўне з прыкметамі мытнага саюза характэрна фарміраванне прынцыпу «чатырох свабод», г. зн. свабоднага перамяшчэння капіталаў, тавараў, паслуг і працоўных рэсурсаў.

**У свеце цікавага.** Першыя мытныя саюзы з'явіліся яшчэ ў XIX ст. (напр., Германскі мытны саюз, Zollverein, які аб'ядноўваў у 1834–1871 гг. шэраг нямецкіх дзяржаў). Напярэдадні Другой сусветнай вайны функцыянавала больш за 15 мытных саюзаў. Але паколькі тады роля сусветнай эканомікі ў параўнанні з унутрынацыянальнай гаспадаркай была невялікай, яны не мелі асаблівага значэння і не прэтэндавалі на ператварэнне ў нешта іншае.

На пятай стадыі краіны аб'ядноўваюцца ў *эканамічны саюз*. Для яго характэрна нараўне з фарміраваннем прынцыпу «чатырох свабод» адзіная сацыяльная, эканамічная і гандлёвая палітыка і мяркуецца ўвядзенне адзінай валюты. Напрыклад, еўрапейская эканамічная супольнасць — прататып сучаснага Еўрапейскага саюза — у 1957 г. была створана як эканамічны саюз. У 1975 г. быў утвораны эканамічны саюз ЭКОВАС — Эканамічная супольнасць дзяржаў Заходняй Афрыкі.

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** Ці можа быць адна дзяржава членам некалькіх інтэграцыйных аб'яднанняў? Якія ўмовы неабходны для ўдзелу краін у інтэграцыйных працэсах? Якія перавагі мае дзяржава, што з'яўляецца членам інтэграцыйнага аб'яднання?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заключнай стадыяй выступае *поўная* (эканамічная і палітычная) *інтэграцыя*. Яе фарміраванне магчыма пры існаванні адзінага валютнага, эканамічнага і палітычнага саюза, правядзенні агульнай знешняй палітыкі, увядзенні адзінага грамадзянства, стварэнні наддзяржаўных органаў кіравання і ліквідацыі дзяржаўных меж.

Эканамічная інтэграцыя прадстаўлена ў дзвюх асноўных формах — рэгіянальнай і галіновай. Рэгіянальная інтэграцыя з'яўляецца найбольш распаўсюджанай у сучасным свеце. Прыкладамі рэгіянальных эканамічных аб'яднанняў выступаюць нараўне з Еўрапейскім саюзам і Паўночнаамерыканскай зонай свабоднага гандлю Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), Азіяцка-Ціхаакіянская эканамічная супольнасць (АЦЭС), Лацінаамерыканская асацыяцыя інтэграцыі (ЛАІ) і інш. Сярод галіновых інтэграцыйных аб'яднанняў прыкметную ролю ў сусветнай гаспадарцы адыгрывае Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты АПЕК, створаная ў 1960 г. для ўніфікацыі нафтавай палітыкі краін-удзельніц.

**Вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб'яднанні свету і іх роля ў развіцці сучаснай сусветнай гаспадаркі.** Сучасныя вядучыя інтэграцыйныя аб'яднанні свету прадстаўлены ў галоўных цэнтрах сусветнай гаспадаркі — Еўропе і Паўночнай Амерыцы. **Еўрапейскі саюз** (мал. 120), які аб'яднаў 28 дзяржаў рэгіёна (мал. 121), з'яўляецца ў цяперашні час вышэйшай стадыяй інтэграцыі ў свеце.

З 1993 г. ЕС сфарміраваўся як эканамічны саюз са свабодным перамяшчэннем капіталу, тавараў, паслуг і працоўнай сілы. З 1985 г. на падставе Шэнгенскай дамовы быў уведзены адзіны памежны кантроль на знешняй мяжы ЕС (у цяперашні час для 26 краін). З 1999 г. існуе валютны саюз у межах еўразоны з адзінай валютай — еўра, які ўключае 19 дзяржаў. У цяперашні час у ЕС пражывае 6,8 % насельніцтва свету, ён вырабляе 17,2 % валавога сусветнага прадукту і 22 % сусветнай прамысловай прадукцыі (мал. 122).



Мал. 120. Штаб-кватэра Еўрапейскага саюза. Бельгія, Брусель



Мал. 121. Краіны Еўрапейскага саюза

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 122. Месца вядучых інтэграцыйных аб'яднанняў у сусветнай гаспадарцы, %: *а* — доля ў колькасці насельніцтва свету; *б* — доля ў валавым сусветным прадукце; *в* — доля ў міжнародным гандлі

***Папрацуем з атласам.*** Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза.

Гадавы даход на душу насельніцтва ў краінах ЕС складае 40,9 тыс. дол. (мал. 123). Больш чым кожны трэці тавар і паслуга, выраблены ў свеце, экспартуюцца ў цяперашні час з Еўрапейскага саюза. На пачатку XXI ст., нягледзячы на поспехі, дасягнутыя ЕС у галіне інтэграцыі, намеціўся шэраг праблем, звязаных з павелічэннем разрыву ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця краін-членаў. Гэта прывяло да міграцыі працоўных рэсурсаў з менш развітых у больш развітыя дзяржавы ЕС, да абвастрэння сацыяльных і эканамічных праблем.




Мал. 123. ВУП на душу насельніцтва ў вядучых інтэграцыйных аб'яднаннях, 2017 г., тыс. дол.

П$_2$

**Свет і Беларусь.** У якія інтэграцыйныя аб'яднанні ўваходзіць Рэспубліка Беларусь? З якімі эканамічнымі праблемамі сутыкаецца Рэспубліка Беларусь, з'яўляючыся ўдзельніцай інтэграцыйных аб'яднанняў?

У Паўночнай Амерыцы вядучым інтэграцыйным аб'яднаннем выступае **НАФТА**. Асноўнай мэтай стварэння гэтай арганізацыі было стымуляванне ўзаемнага гандлю на аснове фарміравання зоны свабоднага гандлю. Па некаторых эканамічных паказчыках гэта аб'яднанне ў цяперашні час апярэджвае ЕС. Аб'ядноўваючы 6,5 % сусветнага насельніцтва, НАФТА выпрабляе 19,5 % сусветнага валавога прадукту і 22 % сусветнай прамысловай прадукцыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з гадавым прыбыткам насельніцтва 42,6 тыс. дол. Па паказчыках долі ў знешнім гандлі гэта аб'яднанне саступае ЕС. Нягледзячы на істотныя пазіцыі НАФТА у сусветнай гаспадарцы, у цяперашні час назіраецца нераўнамерная роля краін у развіцці арганізацыі. Вызначальная роля належыць ЗША.

***Папрацуем з атласам.*** Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў НАФТА.




Мал. 124. Сцягі дзяржаў МЕРКАСУР

Важная роля ў эканамічнай інтэграцыі Лацінскай Амерыкі належыць Паўднёваамерыканскаму агульнаму рынку — **МЕРКАСУР** (мал. 124). Утварыўшыся ў 1991 г., арганізацыя аб'ядноўвае пяць дзяржаў — Аргенціну, Бразілію, Уругвай, Парагвай і Венесуэлу. За гады свайго існавання аб'яднанне стала найбольш уплывовым гандлёва-эканамічным саюзам краін, якія развіваюцца. У цяперашні час МЕРКАСУР выпрацоўвае каля 3,9 % сусветнага валавога прадукту, каля 7 % — сусветнай прамысловай прадукцыі і 2,1 % — сусветнага знешнегандлёвага абароту. На пачатку XXI ст. арганізацыя адчувае шэраг цяжкасцей у развіцці. Гэта звязана з павелічэннем разрыву ва ўзроўні даходаў насельніцтва, з рознагалоссямі ў дачыненні да формы эканамічнай інтэграцыі.

***Папрацуем з атласам.*** Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў МЕРКАСУР.

У апошнія гады значную ролю ў свеце адыгрывае група краін БРІКС, куды ўваходзяць Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і ПАР. Члены БРІКС — гэта краіны з магутнай эканомікай і значнымі рэсурсамі, якія хутка развіваюцца. На гэтыя краіны прыпадае 42 % насельніцтва свету, 26 % плошчы і больш за 30 % ВУП свету. Доля БРІКС у сусветным гандлі перавышае долю ЕС і НАФТА і складае 17 %.

**Падвядзём вынікі.** Міжнародная эканамічная інтэграцыя — гэта ... . Асноўнымі перавагамі інтэграцыі з'яўляюцца ... . Вылучаюць шэсць стадый эканамічнай інтэграцыі. Вышэйшай формай міжнароднай эканамічнай інтэграцыі з'яўляецца Еўрапейскі саюз.

***Праверым свае веды.*** 1. Якія ўмовы неабходны для ўдзелу краін у інтэграцыйных працэсах? 2. Якія выгады атрымлівае краіна ад інтэграцыі? 3. З якімі эканамічнымі праблемамі краіна сутыкаецца пры інтэграцыі? 4. Чым адрозніваецца мытны саюз ад агульнага рынку? 5. Чым адрозніваецца зона свабоднага гандлю ад агульнага рынку?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Якія прыкметы поўнай інтэграцыі адсутнічаюць у Еўрапейскім саюзе? 7. Якія існуюць асноўныя формы эканамічнай інтэграцыі? 8. Ці прадстаўлена поўная інтэграцыя ў сучасным свеце?

***Ад простага да складанага.*** 1. Падрыхтуйце паведамленне, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, аб найбуйнейшых інтэграцыйных аб'яднаннях свету. 2. Абмяркуйце пытанне «Плюсы і мінусы міжнароднай інтэграцыі».

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Закончыце фразы:
- зоны свабоднага гандлю ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі зон свабоднага гандлю з'яўляюцца ... ;
- мытныя саюзы ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі мытных саюзаў з'яўляюцца ... ;
- агульныя рынкі ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі агульных рынкаў з'яўляюцца ... .

2. Запоўніце табліцу ў сшытку, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі.

**Інтэграцыйныя аб'яднанні свету**

| Назва | Штаб-кватэра | Год стварэння | Мэта стварэння | Склад краін-удзельніц |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

П$_3$

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***
Сайт Еўрапейскага саюза.

Сайт НАФТА.

Сайт МЕРКАСУР.

Інтэрнэт-партал СНД.

Міждзяржаўны статыстычны камітэт СНД.

§17-1 §17-2 §17-3

Правообладатель Адукацыя і выхаванне